# Сцяжынка да сямейнага шчасця

**Ж. Л. Васюковіч**,
настаўніца беларускай мовы і літаратуры першай катэгорыі
СШ № 15 г. Пінска

Тэма “Знакі прыпынку ў складаназлучаных сказах”.
Урок прызначаны для правядзення ў 11 класе філалагічнага напрамку
(з рускай і беларускай мовамі вывучання).

Гэта другі ўрок па тэме ў каляндарна-тэматычным планаванні. Тып урока – падагульненне і сістэматызацыя ведаў. Урок цікавы тым, што ўсе этапы аб’яднаны адной тэмай – “сям’я” (прыказкі пра сям’ю, тэкст пра ролю сям’і ў грамадстве, прытча). Выхаваўчы аспект урока – выхоўваць у вучняў пачуццё адказнасці да планавання будучых сямейных адносін. Гэта тэма выбрана невыпадкова, таму што яна вельмі актуальна для выпускнікоў школ, якія знаходзяцца на парозе самастойнага жыцця.

На ўроку выкарыстаны наступныя эфектыўныя метады і прыёмы:

- гульня “Чацвёрты лішні”;
- лічбавы дыктант “Вадаспад ведаў”;
- франтальная работа (праца з тэкстам);
- тэставае заданне;

На развіццё творчых здольнасцей вучняў накіраваны:

- складанне цэнтона;
- метад незакончаных сказаў (па пачатку сказаў прыдумвалі складаназлучаныя, каб атрымаўся акраверш);
- пераклад з рускай мовы на беларускую.

Вынікам урока з’яўляецца рэфлексія. Вучні павінны пабудаваць сімвалічны дом на асацыятыўных паняццях і выбраць сваю “жыццёвую сцяжынку”.

**Мэта ўрока –** узнавіць і пашырыць веды аб складаназлучаных сказах.

**Задачы:**

- ✓ удасканальваць уменне правільна пунктуацыйна афармляць складазлучаныя сказы;
- ✓ актуалізаваць веды аб правілах напісання слоў разам, праз злучок, асобна;
- ✓ стварыць умовы для развіцця крытычнага мыслення, развіцця творчых здольнасцей;
- ✓ выхоўваць у вучняў пачуццё адказнасці да планавання будучых сямейных адносін.

**Тып:** падагульненне і сістэматызацыя ведаў.

**Форма правядзення**: практыкум з элементамі даследчай дзейнасці.

**Абсталяванне**: мультымедыйная прэзентацыя (слайд-шоу пра сям’ю пад музычнае суправаджэнне), дыдактычны матэрыял (тэксты, тэст, рэбус для арфаграфічнай хвілінкі), малюнкі вучняў пра сям’ю.

Галоўны сакрэт удалага шлюбу –
у няшчасцях бачыць выпадковасці,
а выпадковасці не ўспрымаць як няшчасці.

Г. Нікалсан

## Ход урока

**I. Арганізацыйны этап**

*Настаўнік.* Старажытныя грэкі казалі: “Добры настрой – гэта палова перамогі”. Таму ўсміхніцеся, пажадайце добрых адзнак і плённай працы адзін аднаму, а я вам жадаю атрымаць перамогу ў барацьбе за веды.

**II. Актуалізацыя ведаў**

Арфаграфічная хвілінка (разгадаць рэбус; павінна атрымацца “9”) (дадатак 1).

**III. Матывацыйны этап** (выхад на тэму заняткаў)

Гульня “Чацвёрты лішні”.

*Настаўнік.* Паслухайце чатыры сказы (прыказкі), вызначце лішні і патлумачце.

1. Сам Бог рад, калі ў сям’і лад.
2. Чорт не адну пару лапцеў стаптаў, пакуль такую пару сабраў.
3. Нашто клад, калі ў сям’і лад.
4. **З тварам – да вянца, а з розумам – да канца.**

(Лішні сказ чацвёрты, таму што ён складаназлучаны, а ўсе астатнія – складаназалежныя).

**IV. Мэтавызначэнне**

*Настаўнік*. Тэма ўрока “Знакі прыпынку ў складаназлучаных сказах”. Вучні ставяць перад сабой задачы на ўрок.

Якой тэмай аб’яднаны ўсе сказы? (пра сям’ю). Гэта тэма вельмі важная для выпускнікоў, таму што яны знаходзяцца на парозе самастойнага жыцця. Патлумачыць сэнс прыказкі, якую запісалі.

Звярнуць увагу на эпіграф. Запісаць, вызначыць від складанага сказа, растлумачыць знакі прыпынку, пабудаваць схему. Растлумачыць сэнс эпіграфа.

Звярнуць увагу на назву ўрока. Мы будзем на ўроку шукаць сцяжынку да сямейнага шчасця (словы, на якіх трымаецца сямейнае шчасце, хаваюцца пад малюнкамі пра сям’ю).

**V.Інфармацыйны этап**

Паведамленне “маршрута” ўрока: ведаем (тэарэтычны блок), умеем (практычны блок), даследуем (творчая дзейнасць).

**VI. Аперацыйна-пазнавальны этап**

*1. Ведаем.*

**“Вадаспад ведаў”** (лічбавы дыктант). Згодны са сцверджаннем – 1, не згодны – 0.

1) Часткі складаназлучанага сказа адносна раўнапраўныя, самастойныя па сэнсе.

2) Сэнсава-граматычныя часткі звязаны пры дапамозе злучальных злучнікаў.

3) У складаназлучаным сказе павінна быць толькі дзве часткі.

4) Паміж часткамі складаназлучанага сказа ставіцца двукроп’е.

5) Знакі прыпынку паміж сэнсава-граматычнымі часткамі ставяцца абавязкова.

6) Паміж часткамі складаназлучанага сказа можа ставіцца працяжнік.

7) Перад супраціўнымі злучнікамі абавязкова ставіцца коска.

8) Злучальныя злучнікі падзяляюцца на супраціўныя, спалучальныя, размеркавальныя.

9) Коска ставіцца паміж часткамі складаназлучаных сказаў, якія аб’яднаны паўторнымі злучнікамі.

*Узаемаправерка работ* (ключ на дошцы): 110001111

**“Тэарэтычная лабараторыя”** (у вучняў сімвалічнае сонейка з пяццю праменьчыкамі). Напісаць на промнях пункты правіла, калі коска паміж часткамі складаназлучанага сказа не ставіцца.

2. *Умеем* (знаходзіць складаназлучаныя сказы ў тэксце, вызначаць сэнсавую сувязь паміж часткамі, расстаўляць знакі прыпынку, будаваць схемы).

1) Франтальная работа. Праца з тэкстам (у кожнага на парце) (дадатак 2).

- Прачытаць тэкст. Да якога стылю адносіцца?
- Вызначыць асноўную думку тэксту. Ці згодны вы з гэтым выказваннем?
- Знайсці складаназлучаныя сказы, выпісаць і расставіць знакі прыпынку.
- Пабудаваць схемы.

2) Тэматычны кантроль (тэставае заданне (дадатак 3).

- Растлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку і  сэнс выпісаных сказаў.

1. Сямейка малая, а работы ўсім хапае.
2. Уся сям’я разам – і душа на месцы.
3. Мэта абеду ёсць харчаванне, і мэта шлюбу – сям’я.
4. Гаспадар у карчме скача, а гаспадыня ў хаце плача.
5. 1-4, 2-2, 3-5, 4-3, 5-6, 6-1.

**Карэкцыя**

- Хто правільна выканаў усе заданні?
- Якія пытанні ўзніклі пры выкананні тэста?
- Якое заданне падалося найбольш цяжкім?

**Хвілінка адпачынку** (прагляд слайдаў пра сям’ю ў музычным суправаджэнні).

3. *Даследуем* (творчая дзейнасць вучняў)

1) **“Творчая лабараторыя”**. Апераджальнае дамашняе заданне: скласці цэнтон пра сям’ю, выкарыстоўваючы складаназлучаныя сказы. Вучні зачытваюць (дадатак 4).

**2) “Метад незакончаных сказаў”**

“Немагчыма пабудаваць сям’ю без шчасця і кахання”. Вучням прапануюцца пачаткі сказаў па тэме ўрока, якія неабходна завершыць, каб атрымаўся акраверш “Шчасце” (дадатак 5).

**3) “Перакладчыкі”.**

- Перакласці прытчу пра сям’ю з рускай мовы на беларускую (дадатак 2). Назваць складаназлучаныя сказы, патлумачыць знакі прыпынку. Назваць словы, у якіх закладзены асноўны сэнс прытчы.

Жыла-была на свеце сям’я. Была яна незвычайная, таму што займала цэлую вёску. Сям’я была асаблівая: мір і згода панавалі ў ёй. Дайшоў слых пра гэтую сям’ю да самога ўладара краіны, і ён вырашыў праверыць праўдзівасць гэтых чутак. Прыехаў у вёску – і душа яго ўзрадавалася. Спытаў у галавы сям’і, як яны дасягнулі такой згоды. Той сказаў толькі тры словы**: каханне, цярпенне, дараванне.**

(Гэтыя тры словы схаваны пад малюнкамі, і менавіта да іх вядзе сцяжынка сямейнага шчасця).

**VII. Падагульненне**

*Настаўнік.* А з якімі словамі-паняццямі ў вас асацыіруецца сям’я (давер, клопат, падтрымка, павага, вернасць…).

**Пабудова сімвалічнага дома.** “На цаглінках” надрукаваны словы-паняцці, на якіх павінна трымацца сям’я.

**VIII. Рэфлексія**

*Настаўнік*. Перад вамі тры шляхі, тры жыццёвыя лёсы. На кожным з іх сваё шчасце. Па першай дарозе ідзе той, хто лічыць за шчасце багацце, уладу, свабоду. Па другой дарозе крочыць той, хто не верыць у шчасце, лічыць яго прывідам, выдумкай. Трэцюю дарогу выбіраюць тыя, хто пад шчасцем разумее магчымасць мець добрую сям’ю, верных сяброў, каханне. Якую дарогу выбраць, няхай вырашае кожны з вас самастойна і асветліць яе маленькім агеньчыкам шчасця (у кожнага вучня).

**IX. Дамашняе заданне:** скласці невялікае сачыненне-разважанне “Роля сям’і ў сучасным грамадстве”.




**Дадатак 1**

## Арфаграфічная хвілінка

Словы, якія пішуцца разам, адзначце *.

1. па (малу) 2. сарві (галава) 3. заходне (еўрапейскі) 4. супер (маркет) 5. (па) старому звычаю 6. (у)шчыльную 7. (мед)работнік 8. шасці (дзёнка) 9. (грос)майстар 10. (міні) матч 11. не (да) твару 12. (контр)агент 13. (звыш)гукавы 14.(за)адно 15. (у) пяцярых

| | | |
|---|---|---|
| 1 * | 2 * | 3 * |
| 4 * | 5 | 6 * |
| 7 * | 8 * | 9 * |
| 10 | 11 | 12 * |
| 13 * | 14 * | 15 * |

## Дадатак 2
## Тэкст

Каштоўнасць сямейных адносін, мацярынства, павагі да старэйшых – адны з галоўных агульначалавечых каштоўнасцей, на якіх павінна трымацца любое цывілізаванае грамадства. Менавіта ў сям'і закладваюцца паняцці пра дабро і зло. Ніякая кар'ера, грошы, незалежнасць не могуць даць чалавеку таго душэўнага цяпла, пяшчоты, любові, падтрымкі, надзейнасці, якія можа даць яму сям'я.

У сучасным грамадстве высокі ўзровень распаду сямей і многія дзеці не адчуваюць каштоўнасці сямейных адносін. Падлеткі пад уздзеяннем сродкаў масавай інфармацыі аддаюць прыярытэт эгаізму і незалежнасці а сямейныя каштоўнасці адыходзяць на другі план.

Задача сям'і і школы – фарміраваць паўнацэнную асобу з поўным наборам сацыяльна-карысных якасцей.

**Притча**

Жила-была на свете семья. Была она необычная, потому что занимала целую деревню. Семья была особая: мир и лад царили в ней. Дошёл слух об этой семье до самого владыки страны, и решил он проверить правдивость этих слухов. Прибыл он в деревню, и душа его возрадовалась. Спросил у главы семьи, как он достигнул такого согласия. Тот произнёс только три слова: любовь, терпение, прощение.

## Дадатак 3

## Тэст “Знакі прыпынку ў складаназлучаных сказах”

1. Адзначце сказы, у якіх трэба паставіць коску паміж часткамі.
    1. Відаць, маўчала возера ў тумане _ ды вербы плакалі ў цішы.
    2. Травы буйныя _ і жытняе мора.
    3. Зайшоў дзед праз веснічкі на двор _ і сам зачыніў браму.
    4. На досвітку ярчэе мароз _ і свецiцца іней на голлі бяроз.
    5. Сямейка малая _ а работы ўсім хапае.
2. Адзначце сказы, у якіх трэба паставіць працяжнік паміж часткамі.
    1. Колькі перашкод _ і колькі нечаканасцей у іх падарожжы!
    2. Возера зноў зрабілася ціхае і спакойнае _ а вада чыстая і празрыстая.
    3. Дзе-нідзе ў гародчыках чырванелі вясновыя кветкі _ і зацвітаў бэз.
    4. Уся сям'я разам _ і душа на месцы.
    5. Асенні холад  _ і бездарожжа.
3. Адзначце сказы, у якіх знакі прыпынку не ставяцца.
    1. Узмах _ і плёснулася недзе на сярэдзіне ракі блясна.
    2. Сярэдзіна кастрычніка _ і такі мароз.
    3. Момант _ і ў веснічках паказалася Аленка.
    4. Адна хвіліна _і машына чакала ля пад'езда.
    5. Мэта абеду ёсць харчаванне_ і мэта шлюбу – сям'я.
4. Адзначце складаназлучаны сказ
    1. Жонку бяры не на год _ а на век.
    2. Не шукай красу _ а лепш дабрыню.
    3. Гаспадар у карчме скача, а гаспадыня ў хаце плача.
    4. Вецер не сціх _ а з ранейшай сілай хістаў сосны.
    5. Дораг не абед _ а прывет.

5. Насупраць кожнага сказа адзначце нумар умовы, па якой коска паміж часткамі не ставіцца:

1 – наяўнасць агульнага члена сказа; 2 – часткі маюць форму намінатыўных сказаў; 3 – часткі маюць форму безасабовых сказаў; 4 – часткі маюць пытальную ці клічную інтанацю; 5 – у другой частцы прапушчаны выказнік; 6 – дзейнік другой часткі – займеннік *сам*.

1. Дарогі, хто пратаптаў вас і колькі людзей вас перамерала сваімі нагамі ўздоўж і ўпоперак?
2. Сакавітая зяляніна травы і блакіт рачной вады.
3. Сонца будзе свяціць і трава зяляніцца.
4. Лёгка гэтым людзям і ясна ў іх на душы.
5. Хлопец радаваў бацькоў сваімі поспехамі і сам быў задаволены імі.
6. К вечару пакідае звінець неабдымная шырыня летняга дня і кладзецца цішыня на зямлю.

**Адказы:** Заданне 1. 5; заданне 2. 4; заданне 3. 4; заданне 4. 3;
заданне 5. 1 – 4, 2 – 2, 3 – 5, 4 – 3, 5 – 6, 6 – 1.

## Дадатак 4

## ЦЭНТОН

Цудоўны дзень, мае сябры,
Міжнародны дзень сям'і,
Бо вельмі важна для людзей
Выхоўваць у сям'і дзяцей.
Сям'я – маленькая радзіма, сям'я – аснова ўсіх асноў,
Сям'я – гучыць так проста, міла, яна нам ласка і любоў.
**У сям'і вучыцца пачынаем свой самы першы крок рабіць,**
**І толькі нам сям'я дапамагае сумленна, без памылак жыць.**
Сям'я – гэта клопат, заўжды ўзаемны,
Сям'я – гэта хлеба водар прыемны,
Штодзённа – і праца, і адпачынак,
Сям'я – твой надзейны ў жыцці прыпынак.
У гадзіну шчасця, у хвіліну гора
Нам сям'я падорыць радасці святло.
Тут адчуе кожны моцную апору
І любові простай шчырае цяпло.
**Сям'я – твой скарб на ўсё жыццё,**
**І няхай гады мінаюць.**
**Сям'я – кахання пачуццё,**
**І гэта сэрцы адчуваюць.**

## Дадатак 5

## Акраверш "Шчасце"

**Ш** – шчырыя і добразычлівыя адносіны пануюць у нашай сям'і…
**Ч** – чуллівыя адносіны да блізкіх людзей…
**А** – ахінуць цяплом і пяшчотай кожнага члена сям'і…
**С** – самая галоўная каштоўнасць на свеце – сям'я…
**Ц** – цаніце кожнае імгненне, праведзенае з сям'ёй…
**Е** – еднасць усіх пакаленняў…